общество может быть узнаваемым не только по его политической и социально-экономической «биографии», но и, конечно, по оценке его культурного наследия.

## СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ

1. *Анчабадзе, Ю. Д.* Народное искусство в современном обществе (социальная роль и перспективы развития) / Ю. Д. Анчабадзе // Советская этнография. – 1987. – № 4. – С. 38–48.

2. *Базеян, К. Р.* Народное искусство в системе этнической культуры / К. Р. Базеян // Научные труды Ширакского центра арменоведческих исследований. – Гюмри, 2007. – № 7. – С. 76–81. – На арм. яз.

3. *Базеян, К. Р.* Роль и значение народного искусства в контексте сохранения культурного наследия / К. Р. Базеян // Историко-культурное наследие: сб. науч.-информ. ст. – Ереван, 2014. – Вып. 1. – С. 159–166. – На арм. яз.

4. *Базеян, К. Р.* Об исследовании армянских традиционных промыслов, Традиционное и современное в армянской культуре / К. Р. Базеян // Армянская народная культура. XVI / ИАЭ НАН. – Ереван, 2014. – С. 188–194. – На арм. яз.

5. *Давтян, С. С.* Армянское кружево / С. С. Давтян. – Ереван : АН Арм. ССР, 1966. – На арм. яз.

6. *Давтян, С. С.* Армянская вышивка / С. С. Давтян. – Ереван : АН Арм. ССР, 1972. – На арм. яз.

7. *Казарян, М. М.* Армянский ковер / М. М. Казарян. – Лос-Анджелес : Эребуни, 1988. – На арм. яз.

8. *Казарян, М. М.* Художественная резьба по дереву в Армении / М. М. Казарян. – Ереван : Советский писатель, 1989. – 70 с.

9. *Некрасова, М. А.* Народное искусство как часть культуры: теория и практика / М. А. Некрасова. – М. : Изобразительное искусство, 1983. – 344 с.

УДК [745/542+612.32.74]:398(476.1)

**С. Г. Выскварка,**
*загадчык арганізацыйна-метадычнага аддзела*
*дзяржаўнай установы «Любанскі раённы цэнтр культуры»,*
*г. Любань, Рэспубліка Беларусь*

# ЭЛЕМЕНТЫ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ ЛЮБАНШЧЫНЫ. АСАБЛІВАСЦІ БЫТАВАННЯ І ЗАХАВАННЯ

**Анатацыя.** *Нематэрыяльная культурная спадчына, увасабляючы духоўны патэнцыял нацыі, з'яўляецца выразнікам яе светапогляду і*

*менталітэту, этычных норм. У сучаснай рэальнасці існаванне яе знаходзіцца пад пагрозай з-за глабалізацыі і акультурацыі, недасведчанасці грамадства, неразумення каштоўнасці і адсутнасці пераемнасці. Захаванне яе – гэта забеспячэнне жыццядзейнасці і ўстойлівага развіцця, а таксама стварэнне сістэмы аховы з боку дзяржавы і грамадскіх інстытутаў.*

*У дадзеным артыкуле асвятляюцца пытанні аднаўлення, захавання і папулярызацыі пяці элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны.*

**Ключавыя словы**: *нематэрыяльная культурная спадчына, захаванне і папулярызацыя, аўтэнтычнасць, традыцыі і практыкі Любаншчыны.*

**S. Vyskvarka,**
*the Head of the organizational and methodological department of the State Institution "Lyuban district cultural center",*
*Luban, Republic of Belarus*

## ELEMENTS OF THE INTANGIBLE CULTURAL HERITAGE OF LYUBAN REGION. CHARACTERISTICS OF MODE OF LIFE AND PRESERVATION

**Abstract**. *Intangible cultural heritage, embodying the spiritual potential of a nation, is an expression of its worldview and mentality, ethical norms. In today's reality, its existence is threatened by globalization and acculturation, society's ignorance, misunderstanding of value and lack of continuity. Its preservation is the provision of vital activity and sustainable development, as well as the creation of a system of protection by the state and public institutions.*

*This article covers issues of restoration, preservation and promotion of five elements of intangible cultural heritage.*

**Key words:** *intangible cultural heritage, preservation and promotion.*

Захаванне нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны беларускага народа бачыцца важнай дзяржаўнай задачай. Для яе вырашэння ўстановамі культуры Любаншчыны прыкладаюцца немалыя намаганні. У гэтай працы адным з самых цяжкіх кірункаў з’яўляецца вызначэнне, пошук элемента аховы.

На Любаншчыне да пошукавай работы, пабудаванай на прафесійнай аснове, маюць дачыненне работнікі культуры, кіраўнікі і ўдзельнікі фальклорных гуртоў. Займаюцца даследчай працай настаўнікі, бібліятэкары, студэнты. Усе веды акумулююцца ў фальклорным архіве Любанскага раённага цэнтра культуры. Пасля сістэматызацыі і навуковай апрацоўкі, кансультацый са спецыялістамі НАН Беларусі вызначаюцца аб’екты вывучэння і вядзецца праца па іх захаванні і наданні статусу нематэрыяльнай культурнай спадчыны (НКС).

У Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь уключаны пяць элементаў НКС Любаншчыны.

Важным элементам НКС з’яўляецца *«Мясцовы песенны стыль выканання традыцыйных абрадавых і пазаабрадавых песень аўтэнтычнымі фальклорнымі гуртамі “Журавушка”, “Глыбокія крыніцы”, “Павалякі” (вёскі Ямінск, Закальное, Обчын, Любанскі раён, Мінская вобласць)»*, які ў дзяржаўным спісе з 2008 г.

Мясцовая спеўная манера, якой валодаюць нашы аўтэнтычныя выканаўцы, мае непаўторны каларыт. Традыцыйныя спевы Любаншчыны характарызуюць памежную зону этнаграфічных рэгіёнаў: Цэнтральную Беларусь і Паўднёва-ўсходняе Палессе. Ім уласціва захаванасць стылю, разнастайны і рэдкі рэпертуар, асаблівыя меладычныя рады і мелізмы, наяўнасць аўтэнтычных спявачак розных узростаў, што дазволіла ўключыць гэты элемент у дзяржаўны спіс і захаваць яго ў нязменным стане да сённяшняга дня.

*«Беларускія мастацкія практыкі саломапляцення»* – гэты статус гісторыка-культурнай каштоўнасці нематэрыяльнаму праяўленню творчасці чалавека нададзены паводле пастановы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь 20.02.2020 г., № 15. У вялікі рэспубліканскі файл уключаны народны майстар Беларусі Уладзімір Ціханоўскі з аг. Рачэнь (на жаль ужо памёр) і Марына Сярчэня з вёскі Палічнае. Працы У. Ціханоўскага засталіся ў шматлікіх музейных, выставачных і асабістых калекцыях. Асноўная рыса яго творчасці – традыцыйнасць форм і прыёмаў. Найбольш часу аддаваў майстар вырабу традыцыйных галаўных убораў: брылёў, капелюшоў, картузаў, шляпак, прыцягвала яго ўвагу і традыцыйная саламяная скульптура.

Творчы почырк М. Сярчэні вызначаюць тонкае адчуванне гармоніі, шматлікія прыёмы саломапляцення, дасканалыя формы вырабаў, разнастайнасць прадметаў і традыцыйнасць, якая адпавядае мясцовай практыцы, што дазволіла ўключыць майстроў Любаншчыны ў рэспубліканскі файл аховы. Зараз вядзецца праца па перадачы вопыту майстра праз выстаўкі і майстар-класы.

Трэцім элементам нематэрыяльнай культурнай спадчыны з’яўляецца *«Беларускае мастацтва выцінанкі. Любанскі раён, Мінская вобласць»* (у спісе ён з 2021 г., у агульным рэспубліканскім файле раёна яму прысвоены нумар і шыфр).

Пяць майстроў маюць непасрэднае дачыненне да мастацтва выцінанкі. Гэта вядомы народны майстар Наталля Адзінец з аг. Рачэнь, працы якой вылучаюцца аўтэнтычнасцю, кампазіцыйнай дасканаласцю, захаванасцю гістарычнага стылю. Майстры Наталля Цыба і Надзея Астрэйка з г. п. Урэчча, Святлана Адзінец з в. Закальное, Марына Сярчэня з в. Палічнае ствараюць працы на аснове традыцыі, але з творчай фантазіяй. Акрамя ўтылітарных фіранак і сурвэтак яны ствараюць дэкаратыўныя сюжэтныя пано. У кожнага майстра свой стыль і почырк.

Надзея Астрэйка – прафесійны выкладчык Любанскай школы народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Майстэрства хлебапекарства цанілася раней і ў пашане зараз. Такі элемент, як *«Тэхналогія і традыцыі выпякання хатняга хлеба ў вёсках Жораўка і Кузьмічы Любанскага раёна Мінскай вобласці»,* у спісе НКС з 2020 г.

Тэхналогію гатавання хлеба зберaглі для нашчадкаў Ірына Жудрык з в. Жораўка, Таццяна Хоцька, Алена Малікава, Сцепаніда Нагорная, Ніна Міхаленя, Надзея Нагорная з в. Кузьмічы. Традыцыя яго выпякання ў вёсцы Кузьмічы налічвае не адну сотню гадоў. Даўні рэцэпт перадаецца ад пакалення ў пакаленне. Напрыклад, кузьмічанка Ірына Міхайлаўна Жудрык (у дзявоцтве Нагорная) перавезла яго з сабой у вёску Жораўка, куды пайшла замуж.

Роды каранных кузьмічанцаў Міхалені, Пузевічы, Нагорныя выпякаюць хлеб па мясцоваму рэцэпту для патрэб сям’і. Іх хлеб мае не толькі прыемны смак, насычае, але і не чарсцвее два тыдні.

Жораўскі хлеб стаў сімвалам раённых свят: Дажынак, Дня сельскай гаспадаркі, Дня Перамогі. У раёне кожны ведае пра розныя гатункі хлеба: сітны (штодзённы), пшанічны (святочны), хлеб з прысмакамі і хлеб партызанскі. Да апошняга асаблівыя адносіны прадстаўнікоў старэйшага пакалення і дзяцей. Рэцэпт яго прыгатавання патыхае гісторыяй ваенных часоў: такія незвычайныя інгрыдыенты, як размолатыя жалуды, саламяная церуха, кара дрэў, надаюць хлебу незвычайны смак.

Хлеб выконвае функцыю самаідэнтыфікацыі мясцовых жыхароў. Пры Жораўскім доме народных традыцый і Кузміцкім сельскім доме культуры працуюць аматарскія аб’яднанні, якія не толькі знаёмяць з даўнімі традыцыямі, але і экзаменуюць маладых майстроў хлебапячэння.

Элемент НКС *«Стравы з таркаванай бульбы (дранікі, бульбяныя бліны, бабка і іншыя) – традыцыі прыгатавання і ўжывання», Любанскі раён Мінскай вобласці,* у спісе з 13 мая 2022 г.

Да гэтага элемента мае дачыненне амаль кожны жыхар Любанскага раёна. Дранікі на Любаншчыне – страва паўсядзённая і святочная. Гатуюцца яны з нацёртай сырой бульбы, да смаку дадаюцца соль і цыбуля. На Любаншчыне ў розных вёсках сустракаецца некалькі назваў гэтай стравы: «картаплянікі» ці «картафлянікі» (ад мясцовага слова картоплі ці картофлі), «таркаванікі» (ад таркаваць, тарка). Гатуюць дранікі для гасцей, каб паказаць мясцовы каларыт, і на святы, каб было сытна, смачна і традыцыйна. Для класічных дранікаў бульбу нацiраюць на дробную цёрку, для «драцёнкі» ці «вожыкаў» (мясцовыя назвы) – на «бурачнай» цёрцы, да цеста дадаюцца лыжка мукі для клейкасці і часнок для асаблівага смаку. Дранікі выпякаюць у форме аладачак, блінцоў (на ўсю патэльню). Папулярнымі стравамі з нацёртай бульбы, акрамя дранікаў, з’яўляюцца калдуны, «бабкі», галушкі, бульбяныя «кішкі», бульбяныя «картапляныя» бліны.

Варта адзначыць, што на прапанову па наданні дранікам статусу НКС адгукнуліся 15 вёсак, больш за 50 гаспадынь, 10 клубных фарміраванняў.

Праца па пошуку і захаванні элементаў НКС не прыпыняецца ні на хвіліну, сёння ўстановамі культуры Любаншчыны вядзецца збор і апрацоўка інфармацыі, падрыхтоўка неабходных дакументаў па некалькіх традыцыйных з'явах.

Сярод Любанскіх каштоўнасцей вылучаюцца своеасаблівыя «дэлегаты» для ўключэння ў спіс НКС:

– *Традыцыйная танцавальная культура. Рэпертуар і манера выканання.* У раёне зафіксавана 105 народных танцаў, захавалася і актыўна практыкуецца традыцыйная манера іх выканання, наладжана жывое бытаванне элемента праз разнастайныя клубныя мерапрыемствы.

– *Традыцыйны мясцовы веснавы абрад «Жаваронкі» вёскі Забалаць.* Ён запісаны ў 1999 г. і актыўна практыкуецца ўзорным фальклорным калектывам «Нашчадкі» Забалацкага СДК. Абрад не мае аналагаў у Беларусі. Мясцовымі жыхарамі ён прызнаецца каштоўнасцю, што служыць падставай для ўключэння яго ў дзяржаўны спіс.

– *Традыцыйнае шэсце на Макавея і шанаванне святой крыніцы каля вёскі Дарасіно.* Паводле пісьмовых звестак, бытаванне гэтай з'явы зафіксавана ў канцы XVIII ст. Кожны год 14 жніўня практыкуецца святочная падзея жыхарамі вёскі Дарасіно, яна мае шэраг асаблівасцей і мясцовых традыцый.

– *Комплекс абрадавых дзей на «Русальнай нядзелі»* праводзіцца штогод у аграгарадках і вёсках Соснаўскага, Камунараўскага і Малагарадзяціцкага с/с: Сосны-1, Сосны-2, Малыя Гарадзяцічы, Загалле, Палічын, Кузьмічы, Камуна, Нежын. Свята адбываецца па мясцовай традыцыі ў наступную нядзелю пасля Тройцы.

У заключэнне адзначым, што Любанскі раён багаты на гісторыка-культурную спадчыну як матэрыяльных нерухомых аб'ектаў (якіх 13), рухомых (1), так і нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, у ліку якіх мясцовы песенны стыль выканання традыцыйных абрадавых і пазаабрадавых песень, тэхналогіі і традыцыі выпякання хатняга хлеба, практыкі саломапляцення, мастацтва выцінанкі і інш.

УДК 793.22:398.332(476.1)

**Г. А. Гурло,**
*загадчык раённага цэнтра традыцыйнай культуры*
*дзяржаўнай установы «Капыльскі раённы цэнтр культуры»,*
*г. Капыль, Рэспубліка Беларусь*

# ЗАХАВАННЕ І ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ КАЛЯДНАГА АБРАДУ «ЦАРЫ КАЛЯДЫ» в. СЕМЕЖАВА
## (з вопыту работы ўстаноў Капыльскага раёна)

**Анатацыя.** *Асвятляюцца пытанні аднаўлення, захавання і папулярызацыі элемента нематэрыяльнай культурнай спадчыны «Калядныя цары», гісторыя ўзнікнення, аналізуюцца рызыкі існавання абраду, меры па забеспячэнні аховы, ролі носьбітаў традыцый у захаванні і ўздзеянне культурнага турызму на працэсы адраджэння народнай спадчыны.*

**Ключавыя словы**: *гісторыя адраджэння, захаванне і папулярызацыя, культурны турызм, абрад, «Цары Каляды» («Калядныя цары»), Семежава*

**G. Gurlo,**
*Head of the district centre of traditional culture of the State Institution*
*«Kopyl district centre of culture» Kapyl, Belarus*

# PRESERVATION AND POPULARIZATION OF THE CHRISTMAS RITE «CHRISTMAS KINGS» IN THE VILLAGE OF SEMEZHAVA
## (from the experience of Kapyl district institutions)

**Abstract**. *The article analyses the issues of restoration, preservation and popularization of the element of intangible cultural heritage "Christmas Kings", the history of its origin, the risks of the existence of the rite, measures to ensure protection, the role of the bearers of traditions in preservation and the impact of cultural tourism on the processes of revival of national heritage.*

**Key words:** *revival history, preservation and popularization, cultural tourism, ritual, " Christmas Kings ", Semezhava.*

Нематэрыяльная культурная спадчына – тая з’ява, існаванне якой знаходзіцца пад пагрозай з-за глабалізацыі і акультурацыі, недасведчанасці грамадства, неразумення яе каштоўнасці і адсутнасці пераемнасці. І захаванне яе – гэта забеспячэнне жыццядзейнасці і ўстойлівага развіцця, дзеля чаго неабходна эфектыўная сістэма аховы з боку дзяржавы і грамадскіх інстытутаў.